Крынічка

Вядучая рубрыкі Ірына ТАМКОВІЧ. Тэл. 8 (017) 287-18-15

# НЕЗВЫЧАЙНЫЯ ЎЛАСЦІВАСЦІ РАСЛІН

**Калі на загарадным участку людзей адольваюць насякомыя, зусім не абавязкова адразу бегчы ў краму па хімікаты. На дапамогу можна звярнуцца да самой прыроды. Бо ёю створана маса раслін-рэпелентаў, здольных сур'ёзна супрацьстаяць самым розным істотам, якія прыносяць шкоду чалавеку і раслінам.**

**Размарын**

Гэты духмяны куст з лісцікамі-іголачкамі можа адганяць камароў і мух. Калі перад чалавекам стаіць мэта не дапусціць насякомых у дом, расліну можна пасадзіць каля дачнага жылля. Цікава і тое, што з'едлівы пах размарыну адмоўна дзейнічае яшчэ і на кошак. Таму калі гэтыя жывёлы — нежаданыя госці, то можна быць спакойнымі, яны не ступяць на двор, дзе расце размарын.

**Чабор**

Гэтая траўка нароўні з гаючымі ўласцівасцямі валодае здольнасцю супрацьстаяць камарам. Але расліна на корані практычна не аказвае ніякага дзеяння. Для абароны ад насякомых лісткі чабору трэба расцерці. Атрыманай кашкай абмазаць адкрытыя ўчасткі цела і можна быць абсалютна спакойным — дакучлівых крывасмокаў побач не будзе.

**Часнок**

Яго пах многім людзям прыносіць задавальненне, калі ён у якасці прыправы дадаецца ў ежу. А вось маскіты, гізы і камары водар часнаку не пераносяць. Гэтая цудоўная культура, пасаджаная ўздоўж градак і па перыметры садовага ўчастка, здольная абараніць ад лятучай пошасці як у перыяд работы, так і падчас адпачынку.

А яшчэ можна папырскаць градкі сокам часнаку. Раслінам такая працэдура будзе не страшная. А на шкоднікаў гэта падзейнічае прыгнятальна. Наўрад ці яны вырашацца сесці на бацвінне, ды і лётаць побач з градкамі не стануць.

**Базілік**

Водар базіліку адпуджвае мух і камароў, тлю і павуціннага кляшча. Вырашчаную ў чыгуне расліну можна выносіць і ставіць на веранду падчас адпачынку, каб абараніць сябе ад насякомых. Базілік абароніць чалавека і на пэўнай тэрыторыі, калі будзе пасаджаны побач.

# КІВІ Ў ХАТНІХ УМОВАХ

**Вырасціць лазу ківі цалкам рэальна, а яшчэ гэта займальна і не патрабуе адмысловых выдаткаў. Лепшы час для пасеву — з сакавіка па май.**



Ківі вельмі любіць святло і цяпло, таму для яго пасадкі і вырошвання трэба знайсці месца на сонечным падаконніку без скразнякоў. Трэба выбраць самае саспелае ківі з найбліжэйшага магазіна. Яно павінна быць досыць мяккім, роўным і не пашкоджаным. Неабходна памыць фрукт і разрэзаць яго на некалькі частак. Расцісніць акуратна мякаць. Атрыманую масу пакласці ў шклянку з цёплай вадой, змяшаць і даць трохі адстаяцца.

Потым трэба добра прамыць, каб сышла мякаць і засталіся костачкі, якія будуць плаваць на паверхні. Выкладваем насенне на сурвэтку або



папяровы ручнік, каб яно падсохла. Праз 2—4 гадзіны трэба загарнуць костачкі ў вату або тканіну і пакласці ў талерку. Дадаём трохі гарачай вады, каб яна прамачыла матэрыял, але не вылівалася пры нахіле талеркі. Накрываем насенне плёнкай і ставім у цёплае сонечнае месца. На ноч плёнку лепш прыадкрываць або зусім знімаць. Раніцай даліваем неабходную колькасць вады. Праз 7—10 дзён насенне ківі павінна прарасці.

У гаршчок, у якім будзем вырошчваць ківі, насыпаем на дно керамзіт. Грунт лепш узяць гатовы, прызначаны для трапічных ліян. Вельмі пажадана патрымаць яго на вадзяной лазні на працягу дзвюх гадзін. У лункі глыбінёй 5—10 мм кладзём па 2—3 костачкі. Злёгку прысыпаем іх зямлёй, паліваем вадой пакаёвай тэмпературы і шчыльна накрываем плёнкай. Ставім гаршчок у цёплае сонечнае месца. Праз 3—6 дзён з'явяцца першыя ўсходы. Ад неперспектыўных і непатрэбных парасткаў лепш пачаць пазбаўляцца ўжо на гэтым этапе. Паліваць трэба ўмерана і толькі адстаянай вадой. Зімой рост парасткаў ківі запавольваецца, і іх дастаткова паліваць 2—3 разы на месяц. У перыяд вегетацыі (увесну і ўлетку) раслінам патрабуецца больш вільгаці, таму паліваць трэба часцей — 2 разы на тыдзень. Акрамя таго, гарачым летам ківі трэба апырскваць.



Рэгулярна прарэджвайце расліны, каб яны не перашкаджалі адна адной. На ранніх этапах іх можна проста выдзіраць з зямлі. Крыху пазней гэта зрабіць ужо не атрымаецца, бо каранёвая сістэма ў ківі развіваецца даволі хутка. Самым прыдатным варыянтам будзе састрыганне непатрэбнага парастка. Калі расліны дасягнуць у вышыню 10—12 см, перасадзіце іх у асобныя гаршкі. Калі гэтага не зрабіць, іх развіццё замарудзіцца. У спрыяльных умовах цвісці і пладаносіць ківі з насення пачынае на трэці ці чацвёрты год.



# СЁННЯ

## Сонца

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 8.29 | 18.19 | 9.50 |
| Віцебск — | 8.22 | 18.05 | 9.43 |
| Магілёў — | 8.19 | 18.09 | 9.50 |
| Гомель — | 8.12 | 18.09 | 9.57 |
| Гродна — | 8.43 | 18.35 | 9.52 |
| Брэст — | 8.40 | 18.39 | 9.59 |

## Месяц

***Апошняя квадра 18 лютага. Месяц у сузор'і Шаляў.***

## Імяніны

*Пр.* Мікалая, Івана.
*К.* Агаты, Георгіны, Арнольда, Юзафа.



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

# ЗАЎТРА




## УСМІХНЕМСЯ

**— Вова, які сёння мароз!**
**— І не кажы, Міша, градусаў дваццаць!**
**— А памятаеш, які быў спякотны дзень, калі я табе пазычыў грошы?**

Мая жонка хацела купіць сабачку, а я не хацеў. Мы прыйшлі да кампрамісу: сабачку купілі мне.

**І мужчыны, і жанчыны ходзяць у спартзалу дзеля аднаго — каб атрымаць ідэальнае жаночае цела.**

Калі б хада была карысная для здароўя, паштальён быў бы бессмяротным.

Кіт цэлымі днямі плавае, есць толькі рыбу, п'е толькі ваду — і ён тоўсты!

Трус бегае і скача, але жыве ён усяго пяць гадоў.

Чарапаха не бегае, не скача, не плавае, яна ледзь поўзае і... жыве 150 гадоў!

Выснова: ніякіх фізічных практыкаванняў, ніякай дыеты!




Малюнак Андрэя СЛУЦКАГА.

## Даты Падзеі Людзі

**15 ЛЮТАГА**

**1564** год — нарадзіўся Галілеа Галілей, італьянскі вучоны эпохі Адраджэння, адзін з заснавальнікаў дакладнага прыродазнаўства. Пабудаваў тэлескоп з 32-разовым павелічэннем і з яго дапамогай адкрыў горы на Месяцы, 4 спадарожнікі Юпітэра, фазы ў Венеры, плямы на Сонцы.

**1904** год — нарадзілася (г. Мінск) Ларыса Пампееўна Александроўская, выдатная беларуская спявачка, рэжысёр, грамадскі дзеяч, народная артыстка Беларусі і СССР. У 1919—1924 гадах — салістка арганізаванай ёю ж аматарскай трупы пры палітаддзеле Заходняга фронту. З 1951-га — галоўны рэжысёр Дзяржаўнага тэатра оперы і балета Беларусі. Сярод партый: Марыся і Алеся («Міхась Падгорны» і «Алеся» Я. Цікоцкага), Кармэн («Кармэн» Ж. Бізэ), Тацццяна, Ліза і Графіня («Яўген Анегін» і «Пікавая дама» П. Чайкоўскага). Памерла ў 1980 годзе. У 1992-м заснавана прэмія імя Л. Александроўскай у галіне беларускага тэатральнага мастацтва.

**1915** год — нарадзіўся (в. Малахоўцы Баранавіцкага раёна) Іван Канстанцінавіч Кабушкін, удзельнік Мінскага патрыятычнага падполля ў гады Вялікай Айчыннай вайны, Героя Савецкага Саюза (1965, пасмяротна). З 1935 года служыў у Чырвонай Арміі. Удзельнік савецка-фінляндскай вайны. У пачатку Вялікай Айчыннай вайны малодшы лейтэнант Кабушкін трапіў у акружэнне, прыйшоў у Мінск і ўключыўся ў антыфашысцкую барацьбу. На чале невялікай баявой групы ажыццяўляў разведвальныя і дыверсійныя аперацыі. З мая 1942-га — кіраўнік аператыўнай групы Мінскага падпольнага гаркама КП(б)Б па барацьбе з правакатарамі і варожымі агентамі. Здабываў зброю, боепрыпасы, медыкаменты, выратоўваў людзей з лагераў смерці. Удзельнічаў у выданні і распаўсюджванні падпольных выданняў. Загінуў у 1943 годзе.



**1917** год — 100 гадоў таму нарадзіўся (г. Мінск) Іван Іванавіч Семянюк, Герой Савецкага Саюза. У Вялікую Айчынную вайну — з чэрвеня 1941 года на Паўднёвым, Закаўказскім, Паўночна-Каўказскім, Варонежскім, 1-м Украінскім франтах. Камандзір звяна, эскадрыллі. Вызначыўся ў баі пад Курскам 2 чэрвеня 1943 года. Будучы вядучым групы з 6 самалётаў, уступіў у бой з 18 бамбардзіроўшчыкамі і знішчальнікамі ворага: 8 гітлераўскіх машын збіў асабіста і яшчэ 3 — у складзе групы. За перыяд вайны здзейсніў 430 баявых вылетаў, правёў 125 паветраных баёў, збіў 19 самалётаў праціўніка. Да 1961 года служыў у Савецкай Арміі, палкоўнік. Памёр у 1973 годзе.

## Было сказана

**Андрэй ВАСІЛЬЕЎ, рускі пісьменнік:**

*«Надзейнасць — адна з найлепшых чалавечых якасцяў. Магчымасць абаперціся на чалавека, здольнасць давяраць яго слову... Хіба не так?»*

ЗВЯЗДА БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА, ВЫДАДЗЕНАЕ МІНІСТЭРСТВАМ ІНФАРМАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ.

Дырэктар — галоўны рэдактар СУХАРУКАЎ Павел Якаўлевіч.

РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: Н. ДРЫНДРОЖЫК, Н. КАРПЕНКА (першы намеснік галоўнага рэдактара), А. ЛЯЎКОВІЧ (першы намеснік дырэктара), М. ЛІТВІНАЎ (намеснік галоўнага рэдактара), В. МЯДЗВЕДЗЕВА (намеснік галоўнага рэдактара), А. КЛЯШЧУК, Н. РАСОЛЬКА, С. РАСОЛЬКА, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК (намеснік галоўнага рэдактара).

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

ТЭЛЕФОНЫ Ў МІНСКУ: прыёмнай – 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, маркетынгу — 284 44 04, бухгалтэрыі: 287 18 81.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zviazda.by,
(для зваротаў): zvarot@zviazda.by

ПРЫЁМ РЭКЛАМЫ тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zviazda.by

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 5 разоў на тыдзень.

Тыраж 20.008. Індэкс 63850. Зак. № 682.

Нумар падпісаны ў 19.30 14 лютага 2017 года.

М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12